*Сцепанцоў А. І.,*

кандыдат культуралогіі, дацэнт,
загадчык кафедры культуралогіі
і псіхолага-педагагічных дысцыплін
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

## АГРАГАРАДКІ: НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ Ў АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Знакавым для нашай краіны стаў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўнай праграме адраджэння сяла на 2005—2010 гады». Дзяржаўная праграма кансалідавала ў гэты перыяд значныя бюджэтныя сродкі для развіцця аграрнага сектара эканомікі (перш за ўсё на тэрыторыях, дзе размешчаны аграгарадкі), што падмацавала эканамічныя асновы сельскай вытворчасці. Быў створаны 1481 аграгарадок, у тым ліку: у Мінскай вобласці — 325; у Віцебскай — 254; у Гродзенскай — 239; у Гомельскай — 238; у Брэсцкай — 222; у Магілёўскай — 203.

За мінулыя гады многія пасёлкі Беларусі набылі новыя рысы сучасных паселішчаў: з'явіліся добраўпарадкаваныя плошчы, змянілася архітэктура забудовы. Некаторыя ўстановы культуры трансфарміраваліся ў сучасныя адпачынкавыя цэнтры, інтэгрыруючыя ў сабе шырокі спектр арганізацыі вольнага часу насельніцтва.

За час рэалізацыі Дзяржпраграмы адраджэння і развіцця сяла культурная прастора папоўнілася ўстановамі культуры новага тыпу (гл. табл. 1), пашырылася камп'ютарызацыя сельскіх бібліятэк[1].

*Табліца 1*

| Назва кірунку | Колькасць 2005—2010 гг. | |
|---|---|---|
| | план | факт |
| Стварэнне ўстаноў культуры новага тыпу | 186 | 231 |
| Стварэнне сельскіх і раённых дамоў рамёстваў | 22 | 29 |
| Фарміраванне мабільнай сеткі ўстаноў культуры (аўтаклубы, бібліобусы, перасоўныя відэакомплексы) | 354 | 371 |
| Камп'ютарызацыя буйных сельскіх бібліятэк з падключэннем іх да сеткі інтэрнэт | 954 | 1054 |
| Арганізацыя пляцовак філарманічнага і тэатральнага абслугоўвання насельніцтва | 250 | 286 |
| Адкрыццё філіялаў і класаў дзіцячых школ мастацтваў | 118 | 301 |

[1] Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.]; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. — Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. — С. 59.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіраўніцтва краіны паслядоўна і мэтанакіравана ўзяло курс на развіццё сельскай гаспадаркі: Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 342 ад 1 жніўня 2011 г. была зацверджана Дзяржаўная праграма ўстойлівага развіцця сяла на 2011—2015 гг. Прадугледжана павышэнне эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу як асновы для вырашэння задач сацыяльнага характару на базе ўжо створаных аграгарадкоў, а таксама на развіццё зон іх уплыву — бліжэйшых сёл (у частцы інжынерна-транспартных камунікацый і іншых сацыяльна значных аб'ектаў). Актуальнасць набывае для аграгарадкоў удасканаленне сацыяльна-культурнай дзейнасці сельскіх устаноў культуры, якая мае як асобасны, так і грамадскі сэнс. Адной з умоў камфортнага жыцця ў аграгарадках становіцца арганізаваны вольны час як вынік сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Сельская культурна-адукацыйная сфера цесна звязана з лакальнай сацыяльна-эканамічнай прасторай і напрамую залежыць ад эканамічнага становішча рэгіёна. Дэмаграфічны патэнцыял, сучасны і будучы, складае адзін з вызначальных фактараў развіцця аграгарадкоў. Даныя пасяленні па тэрыторыі краіны размеркаваны раўнамерна, аднак іх дэмаграфічны складнік істотна адрозніваецца: назіраецца прасторавая дыспрапорцыя паміж раёнамі па долевых суадносінах жыхароў і населеных пунктаў у рассяленча-дэмаграфічнай структуры краіны. Па ступені спрыяльнасці дэмаграфічнай сітуацыі і крыніцы росту дэмаграфічнага патэнцыялу даследчыкі выдзяляюць тыпы аграгарадкоў: сталічнага ўрбанізаванага тыпу; цэнтральнага тыпу; пераходнага тыпу, перыферыйнага тыпу[2].

Паселішчы *першага тыпу* размешчаны толькі ў Мінскім раёне (іх 27), яны здольныя да самастойнага дэмаграфічнага развіцця за кошт захавання натуральнага прыросту як мясцовага сельскага насельніцтва, так і мігрантаў. Для іх характэрна ўстойлівая сельскагаспадарчая вытворчасць, таксама ёсць прадпрыемствы па абслугоўванню сталіцы, многія з жыхароў аграгарадкоў маюць пастаянную працу ў Мінску. З усіх аграгарадкоў Мінскага раёна каля трох (Шчамысліца, Сенніца, Азярцо) бачацца ў недалёкай будучыні як гарадскія мікрараёны сталіцы[3].

Населеныя пункты *другога тыпу* ў большасці здольныя да самастойнага дэмаграфічнага развіцця, асноўнай крыніцай якога ў перспектыве можа стаць натуральны прырост насельніцтва. Значная частка знаходзіцца каля абласных цэнтраў і буйных гарадоў, утвараючы своеасаблівыя сацыяльна-эканамічныя

[2] Гл., напрыклад, Антипова, Е. А. Демографический потенциал агрогородков как новой форма сельских поселений Беларуси / Е. А. Антипова // Аграрная экономика. — 2008. — № 3. — С. 45—50; Флерко, Т. Г. Геоэкологические условия размещения агрогородков Гомельской области / Т. Г. Флерко // Вестник Том. гос. ун-та. — 2010. — № 330. — С. 211—214.

[3] Аграгарадкі — мікрараёны сталіцы [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : realty.tut.by/news/expertise. — Дата доступу : 30.01.2016.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кластары. Кластарны падыход дазваляе больш поўна выкарыстоўваць сыравінны, кадравы і працоўны патэнцыялы, забяспечваць выхад на рынкі, стымулюе павелічэнне колькасці малых прадпрыемстваў. У гэтых паселішчах таксама больш развітая сацыякультурная інфраструктура, а таксама гастрольна-выязное «культурнае» абслугоўванне насельніцтва. На гэтай аснове адзначаецца і больш развіты сацыякультурны патэнцыял жыхароў, іх актыўная ўключанасць у культурнае жыццё свайго рэгіёна. Сярод такіх паселішчаў — аграгарадок Лошніца Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. У ім пражывае каля 7 тыс. чалавек, што дазваляе яму канкурыраваць з паселішчамі першага тыпу. У 5 кіламетрах ад г. Баранавічы паявіўся аграгарадок Русіна з насельніцтвам каля 2 тыс. чалавек. Тут сярод аб'ектаў культуры выдзяляецца Цэнтр рамёстваў, які размяшчаецца ў аднаўленай сялянскай сядзібе пачатку XX ст.: на яе тэрыторыі — «альтанка»-бяседка, кузня, драўляны млын. Арганізавана навучанне рамёствам: ганчарству, пчалярству, ткацтву, разьбе па дрэву. Не саступіць гарадскому ўзровень жыцця аграгарадка Тамашоўка ў Брэсцкім раёне. Спарткомплекс «Зорны» будзе гонарам для любога горада: 2 басейны з пастаянным абнаўленнем вады, спартзалы, футбольны стадыён са штучным пакрыццём, тэнісны корт, баскетбольная і валейбольная пляцоўкі. *Цэнтр культуры і вольнага часу* аграгарадка Верцялішкі, што ў 20 км ад Гродна, — культурны брэнд раёна, прыцягальная прастора для аматарскай мастацкай творчасці і зносін.

У Магілёўскім раёне размешчаны шэраг аграгарадкоў з насельніцтвам звыш 1500 чалавек кожны: Вейна, Усход, Дашкаўка, Кадзіна, Мяжысеткі, Палыкавічы. Устойлівае эканамічнае становішча такіх буйных аграгарадкоў дазваляе падтрымліваць і садзейнічаць развіццю сацыяльна-культурнай інфраструктуры паселішчаў. Такія аграгарадкі маюць выразную планіровачную структуру, высокі ўзровень добраўпарадкавання, наяўнасць грамадскіх будынкаў сучаснай архітэктуры, комплекс бытавых паслуг гарадскога ўзроўню.

Аграгарадкі *трэцяга тыпу* (пераходнага) выбарачна здольныя да самаразвіцця пры інвестыцыйнай падтрымцы дзяржавы і змяншэння колькасці насельніцтва. Працоўныя месцы даюць буйныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і комплексы, напрыклад, аграгарадкі ў Гомельскай вобласці: Камунар (Буда-Кошалёўскі раён) — буйная бройлерная фабрыка, Холмеч (Рэчыцкі раён) — пладова-ягадная гаспадарка, Ціхінічы (Рагачоўскі раён) — комплекс па вытворчасці малака. Аграгарадок Сталовічы (Баранавіцкі раён) мае малочны таварны аўтаматызаваны комплекс на тысячу галоў жывёлы, Бігосава (Верхнядзвінскі раён, Віцебская вобласць) — прадпрыемства вырабаў з палімерных матэрыялаў заатэхнічнага і ветэрынарнага прызначэння «Інвет».

Аграгарадкі *чацвёртага тыпу* знаходзяцца ў горшым сацыяльна-эканамічным становішчы ў параўнанні з іншымі і не здольныя да самастойнага дэмаграфічнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця. Дадзеныя паселішчы маюць складанасці ў развіцці сацыяльна-культурнай інфраструктуры, валодаюць абмежаванымі магчымасцямі ў арганізацыі вольнага часу насельніцтва. Асноўным фактарам іх развіцця могуць стаць міграцыйныя працэсы пры ўмове стварэння прывабнасці сельскай мясцовасці аграгарадкоў дадзенага тыпу. У дачыненні да іх патрабуецца распрацоўка стратэгіі дэмаграфічнай рэабілітацыі, інвесціравання і адраснай сацыяльнай падтрымкі.

Дзяржаўная праграма адраджэння сяла вызначыла адной з найважнейшых дзяржаўных задач зберажэнне і развіццё сяла як захавальніка нацыянальных традыцый, беларускай мовы, фальклору, народнай творчасці. Такім чынам былі створаны перадумовы да паляпшэння доступу розных груп сельскага насельніцтва да культурных каштоўнасцей, удасканалення культурна-адпачынкавай дзейнасці ў сельскай мясцовасці, захавання і развіцця традыцыйнай культуры рэгіёнаў.

Арганізацыйным адказам на сучасныя патрабаванні стала стварэнне інтэграваных устаноў культуры. Інтэграцыя адпачынкавых напрамкаў у адзіным комплексе дазваляе ствараць прастору свабодных зносін, аматарства, майстэрства. Прыклады такіх комплексаў маюцца ў кожнай вобласці. Адзін з такіх — Лаўжанскі сельскі цэнтр культуры і вольнага часу аграгарадка Нікіціха Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці. Цэнтр творчасці і зносін спалучае клубную практыку, мастацкае выхаванне, розныя формы дадатковай адукацыі. У зону яго абслугоўвання ўваходзяць 17 населеных пунктаў. З 2010 г. працуе філарманічная пляцоўка, праводзяцца культурныя мерапрыемствы абласнога і раённага ўзроўню. З канца 2011 г. ажыццяўляецца праект «Нікіціхінская глыбінка», мэта якога — папулярызацыя традыцыйнай і сучаснай народнай творчасці, найгрышаў на гармоніку, прыпевак, скокаў, рамёстваў. Аматарскім калектывам — клубам «Ветэран» быў адроджаны і запісаны народны танец «Лаўжанская кадрыля».

Значная частка сельскіх населеных пунктаў, на аснове якіх створаны сучасныя аграгарадкі, маюць багатае гістарычнае мінулае (300—500 гадоў гісторыі і больш) і культурную спадчыну, насычаны гістарычнымі падзеямі, далі знакамітых ураджэнцаў, маюць выдатныя археалагічныя, архітэктурныя, культурныя помнікі, а таксама помнікі прыроды. Сельскія тэрыторыі, дзякуючы сваёй унікальнасці, валодаюць вялікімі патэнцыяльнымі магчымасцямі для развіцця аграэкатурызму. Гэты напрамак звязаны з сельскім прадпрымальніцтвам, са стварэннем працоўных месцаў у сацыяльна-культурнай сферы.

Варта пагадзіцца з меркаваннем, што пабудова аграгарадкоў зможа станоўча вырашыць праблему аднаўлення гістарычных сядзіб, маёнткаў, старадаўніх паркаў. Адноўленыя аб’екты змогуць прыцягваць турыстаў, тым самым інвесціраваць сродкі для развіцця інфраструктуры аграгарадкоў, садзейнічаць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

устойлівасці развіцця сельскай мясцовасці. Гэтаму можа спрыяць выкарыстанне гістарычных сядзіб як культурна-турысцкіх аб'ектаў, адкрыццё на іх аснове музеяў, культурна-забаўляльных, культурна-адукацыйных турысцкіх комплексаў. Аднаўленне такіх аб'ектаў дазволіць развіваць іх як цэнтры турызму не толькі мясцовага, але міжнароднага ўзроўню.

Прайшло дзесяць гадоў з моманту прыняцця Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 372[4] «Аб мерах па развіццю аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь», у якім пазначаны прэферэнцыі і палёгкі для развіцця агратурызму ў краіне.

У апошнія гады назіраецца тэндэнцыя развіцця турызму ў сельскай мясцовасці. Па даных Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь на канец 2014 г. колькасць суб'ектаў аграэкатурызму ў рэспубліцы склала 2037 (на 156 суб'ектаў больш, чым у 2013 г.), у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 296, Віцебскай — 502, Гомельскай — 228, Гродзенскай — 281, Мінскай — 541, Магілёўскай — 189. Колькасць турыстаў, якія карысталіся паслугамі аграэкатурызму за 2014 г., — 318,8 тыс. чалавек, што на 17,3 % больш, чым у 2013 г. Грамадзян Рэспублікі Беларусь у агульным ліку аграэкатурыстаў — 86,9 %[5].

Актыўна распрацоўваюцца турыстычныя маршруты. Сельскія гаспадары прапануюць не толькі простыя пешыя вандроўкі з пікнікамі, але і аглядныя экскурсіі да гістарычных помнікаў, якія знаходзяцца ў бліжэйшых гарадах. Становяцца папулярнымі майстар-класы па асваенню розных рамёстваў. Для прыцягнення турыстаў арганізуюцца разнастайныя анімацыйныя праграмы.

Падаецца цікавым і крэатыўным вопыт турыстычнага кластара «Валожынскія гасцінцы». Ён дзейнічае з 2008 г. і аб'ядноўвае гаспадароў аграсядзіб, рамеснікаў, арганізатараў актыўнага турызму, прадстаўнікоў мясцовай улады Валожынскага раёна. Турыстам прапануюцца разнастайныя паслугі і прадукты: начлег і сілкаванне, экскурсіі, турпаходы, анімацыйныя праграмы, вырабы народных майстроў. Дзейнічае некалькі экамузеяў. Праводзяцца мясцовыя фэсты: салодкі «Цукеркавы фэст» у Івянцы і «Вольнае паветра» — летняе свята беларускай этнічнай і альтэрнатыўнай музыкі ў аграсядзібе Шаблі. Быў пракладзены першы невялікі (20 км) веламаршрут да экамузея Брама ў Налібокі. У 2013 г. турыстам прапанавалі веламаршрут па Валожынскім раёне — ад станцыі Багданаў да станцыі Радашковічы (каля 150 км). Ён уключае экамузеі, аграсядзібы, прыродныя і гістарычныя славутыя мясціны. «Валожынскія гасцінцы» прапануюць таксама пешы, конны (вярхом і ў дыліжансах), узімку — лыжны актыўны турызм, улетку — сплаў на байдарках па Бярэзіне і Іслачы.

---

[4] О мерах по развитию агроэкотуризма в Республике Беларусь: Указ Президента Республики Беларусь от 02.06.2006, № 372 [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://belstat.gov.by.

[5] Туризм в Республике Беларусь в 2014 году [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/otrasli-statistiki/naselenie/turizm.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Увосень 2012 г. адбыўся старт новага для нашай краіны праекта па стварэнню турыстычных дэстынацый, для якіх пасля былі распрацаваны стратэгіі ўстойлівага развіцця экалагічнага турызму.

Дэстынацыя (англ. destination — пункт прызначэння) — гэта месца (тэрыторыя) наведвання, якое прываблівае турыстаў сваімі прыроднымі і рэкрэацыйнымі рэсурсамі, асаблівасцямі, гістарычнай і культурнай спадчынай. На конкурснай аснове былі адабраны 17 турыстычных дэстынацый (7 — у Брэсцкай і 10 — у Гродзенскай абласцях) з крэатыўнымі праектамі сваіх тэрыторый. Рэалізацыю гэтых праектаў ажыццяўлялі прадстаўнікі прыватнага бізнесу, у тым ліку

Карта турыстычных дэстынацый праекта USAID «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё», рэалізуемага ПРААН (прадстаўніцтва ў Беларусі) і Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і ўладальнікі аграсядзіб, няўрадавых арганізацый, мясцовых органаў кіравання[6]. Актыўную падтрымку турыстычным праектам аказвае Белаграпрамбанк: крэдыты былі выдаткаваны на 540 унікальных праектаў.

Для падтрымкі сельскага турызму дзейнічае ліберальная крэдытная палітыка.

Пра перспектывы развіцця агратурызму ішла гаворка ў лістападзе на традыцыйнай V Міжнароднай спецыялізаванай канферэнцыі «Аграэкатурызм–2015: інавацыі і тэрытарыяльнае развіццё». З прэзентацыяй «Аграэкатурызм як каталізатар развіцця сельскіх тэрыторый: беларускі досвед» выступіла В. Кліцунова, кіраўнік Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы». У якасці прыкладу, сярод іншых, яна прывяла дынамічнае развіццё дэстынацыі «Мухавецка кумора» з займальнымі знаходкамі і задумкамі[7]. Гэта турыстычны кластар, які аб'ядноўвае шэраг аграсядзіб Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў уздоўж ракі Мухавец, турыстычныя комплексы і агенцтвы, рамесныя і ваенна-гістарычныя клубы, фальклорныя калектывы, прадстаўнікоў СМІ і актыўных творчых людзей. Турыстаў зможа таксама зацікавіць самае старажытнае гідратэхнічнае збудаванне Беларусі, якім з'яўляецца канал Боны. У дэстынацыі ладзяцца фестывалі, у аграсядзібах прапануюць хлеб па старадаўніх рэцэптах, салома- і лозапляценне, мылаварэнне.

Сельскі турызм у многіх краінах з'яўляецца складнікам комплекснага сацыяльна-эканамічнага развіцця сяла і адным са сродкаў рашэння сельскіх праблем. Цалкам відавочна, што развіццё сельскага турызму зможа спрыяць малому прадпрымальніцтву, пашырыць магчымасці занятасці і атрымання дадатковых прыбыткаў жыхарамі сяла за аказанне турыстычных паслуг: размяшчэнне для пражывання турыстаў, харчаванне, гандаль, рамяство.

Развіццё турызму асабліва актуальна для тэрыторый з прыроднымі і культурнымі каштоўнасцямі, багатымі на народныя традыцыі, з адпаведнай інфраструктурай.

Для развіцця турызму ў сельскай мясцовасці патрабуецца каардынацыя ўдзельнікаў — суб'ектаў сельскага турызму. Неабходны ўзровень арганізацыі дае кластарны падыход, які дазваляе забяспечыць практычную рэалізацыю праектаў па павышэнню канкурэнтаздольнасці турыстычных тэрыторый (дэстынацый). Фарміраванне турысцка-рэкрэацыйных кластараў стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця турысцкай інфраструктуры, а таксама сферы паслуг.

---

[6] Турыстычныя дэстынацыі Беларусі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://www.tio.by. — Дата доступу : 9.02.2016.

[7] Прэзентацыя «Аграэкатурызм як каталізатар развіцця сельскіх тэрыторый: беларускі досвед» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://belarus.tio.by/presentations/Na-konferencii-po-agroturizmu-obsudili-kreativnost-napravleniya-i-nametili-perspektivy-razvitiya. — Дата доступу : 8.02.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разгледжаныя дэстынацыі, на наш погляд, маюць патрэбу ў аб'яднанні намаганняў па задавальненню турыстычнага попыту. Дэстынацыі як лакальныя турыстычныя тэрыторыі не могуць забяспечыць самастойна ўвесь спектр магчымых запатрабаванняў турыстаў. Сусветная турысцкая арганізацыя адзначае, што ў час сямідзённага знаходжання наведвальнікаў у аддаленым турысцкім цэнтры задзейнічаецца каля 30 розных фірмаў, пачынаючы з экскурсійнага бюро, спецыялізаваных крам турысцкай літаратуры, страхавых кампаній да сувенірных крам, пунктаў абмену валюты, таксі і інш. У турысцкім кластары мяркуецца сістэма накаплення вартасці, якая ўключае ланцужкі вартасці пастаўшчыкоў (першым чынам транспартных кампаній), сродкаў размяшчэння і забаваў, каналаў збыту турысцкіх прадуктаў (тураператары, турагенты), а таксама саміх пакупнікоў-турыстаў[8].




Неабходна ініцыятыва выканаўчых органаў дзяржаўнай улады рэгіёнаў па стварэнню бізнес-асацыяцый у межах дзяржаўна-прыватнага партнёрства, якія змогуць стаць каардынуючай асновай абласных турысцкіх кластараў. Толькі калектыўны падыход зможа забяспечыць устойлівае развіццё турыстычных дэстынацый, падтрымаць і пашырыць зацікаўленасць турыстаў — як айчынных, так і замежных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[8] Александрова, А. Ю. Современные проблемы сервиса и туризма / А. Ю. Александрова. — 2007. — № 1. — С. 51—61.